УДК 947.2

А. А. Дамарад, аспірант

# ІНКАРПАРАЦЫЯ ВЫШЭЙШАЙ АРЫСТАКРАТЫІ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ДВАРАНСТВА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (КАНЕЦ XVIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XIX СТ.)

Aristocracy of the Belarusian grounds integrated in structure of the Russian nobility in different ways.

Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі прымусілі вышэйшы стан грамадства адаптавацца да новых умоваў жыцця. Кожны яго прадстаўнік павінен быў найперш прысягнуць на вернасць расійскім уладам. Зразумела, арыстакратыя былой Рэчы Паспалітай не жадала губляць свае тытулы і прывілеі, таму прысягала новым уладам.

Неабходна адзначыць, што дастаткова вялікая колькасць такіх асоб спачатку пацвярджала свой тытул па-за межамі Расіі. Вядомыя роды князёў Друцкіх-Любецкіх і князёў Панінскіх засведчылі свае тытулы ў 1798 г. у Аўстрыйскай імперыі і ў 1818 г. у Каралеўстве Прускім адпаведна [1, с. 2–3]. Пазней яны пацвердзілі свае тытулы і ў Расійскай імперыі. Ужо ў 1809 г. Мінскі дваранскі дэпутацкі сход прыняў рэзалюцыю, паводле якой усе прадстаўнікі роду Друцкіх-Любецкіх прызнаны ў дваранскай і княскай годнасці [2, л. 35]. Праўда, канчатковае прызнанне княскага тытула адбылося пасля загада Імператара толькі ў 1830 г., калі «во время бывшего в Царстве Польском мятежа, князь Друцкий-Любецкий сохраняя верноподданические к Его Императорскому Величеству чувства, когда не был в состоянии, по долгу службы и присяги, противодействовать злоумышлениям мятежников, то вместе с другими, прибывшими верными Его Величеству членами правительства (Царства Польскага – *А. Д.*), вышел из состава оного и прибыв в Санкт-Петербург исполнял здесь высочайшие поручения» [2, л. 202].

Увогуле, вялікая колькасць канчатковых прызнанняў тытулаў для арыстакратыі, якая мела беларускія карані, адбываецца менавіта падчас і пасля паўстання 1830–1831 гг. Звязана гэта, па-першае, з тым, што некаторыя асобы сваёй службай і барацьбой з паўстанцамі даказалі сваю вернасць цэнтральным уладам. Сярод такіх неабходна згадаць барона Івана-Фёдара фон Тыпальта, які вызначыўся ў штурме Варшавы [3, л. 234]. Самае цікавае, што бароны фон Тыпальты настолькі ўкараніліся ў Рэжыцкім павеце, што запісаны былі не ў пятую, а ў шостую частку радаслоўнай кнігі Віцебскай губерні, што не адпавядала грамаце, пажалаванай Кацярынай II яшчэ ў 1785 г. [4].

Такім чынам, працэс прызнання тытулаў мясцовай арыстакратыі быў першым крокам на шляху інкарпарацыі вышэйшай часткі шляхты ў расійскае дваранства. Аднак прызнанне тытула яшчэ не з'яўлялася само па сабе адзнакай інкарпарацыі ў дваранства Расійскай імперыі. Патрабавалася нейкім чынам вызначыцца з асяродка шляхты былой Рэчы Паспалітай. Для гэтага існавала некалькі магчымасцей, першай з якіх быў шлюб прадстаўнікоў мясцовай арыстакратыі з асобамі, якія належалі да ўласна расійскага дваранства [5, с. 205]. Найбольш паказальнымі тут з'яўляецца шлюб Стэфаніі, дачкі Дамініка Радзівіла, з Людвігам Леанам Вітгенштэйнам і князя Ксаверыя Любамірскага з Марыяй Львоўнай Нарышкінай [6, с. 29]. Калі першы з іх адбыўся з дазволу самаго Аляксандра I і зрабіў Вітгенштэйнаў адным з найбольш буйных землеўласнікаў на Беларусі, то другі адкрыў прамы доступ сынам князя Любамірскага ў кола вышэйшай расійскай арыстакратыі. Дзякуючы гэтаму старэйшы сын Ксаверыя Любамірскага Канстанцін стаў генерал-ад'ютантам імператара Аляксандра I.

Увогуле, вайсковая служба стала галоўным сродкам інкарпарацыі арыстакратыі былой Рэчы Паспалітай у расійскае дваранства. Так, граф Канстанцін Іванавіч Развадоўскі, які паходзіў са шляхты Мінскай губерні, быў камендантам Варшавы, жанаты на прадстаўніцы рускага дваранства, а яго дачка Варвара пабралася шлюбам з ротмістрам лейб-гвардыі Уланскага Яго Вялікасці палка Уладзімірам Пашчанка [7, л. 8].

Той жа князь Ксаверый Любамірскі яшчэ з 1777 г. быў генералам расійскіх войскаў, камандзірам Тамбоўскага палка [8, с. 32], а згаданы барон фон Тыпальт, акрамя таго, што сам быў вайскоўцам, пакінуў сыноў, якія таксама служылі ў расійскай арміі. Карл Іванавіч, лейб-гвардыі палкоўнік, у 1850–1855 гг. камандаваў элітным Коннагрэнадзёрскім палком. Але яго-ны брат, Себасціян-Аляксандр, памешчык Рэжыцкага павета, дзе ім быў набыты маёнтак Іванаўка, згаданы толькі як паручнік у адстаўцы. Затое сыноў у яго было аж тры: Альберт, Максімільян і Апалiён (ці Апалон)-Мікалай [3, л. 239]. Капітан барон Апалон Аляксандравіч Тыпальт перабраўся ў Цэнтральнае Чэрназем'е, зрабіўшыся там памешчыкам Валуйскага павета. Унесены ў пятую

частку Радаводнай кнігі Варонежскай губерні. Нямецкая прыстаўка «von» перад прозвішчам, дарэчы, там паступова страчваецца.

Найбольш яскравай праявай інтэграцыі ў шэрагі расійскага дваранства з'яўлялася уключэнне роду ў Агульны гербоўнік дваранскіх родаў Расійскай імперыі, што было гарантыяй радавітасці і значнасці таго ці іншага дваранскага дому, і адначасова выводзіла яго на агульнаімперскі ўзровень. Так, герб баронаў Тыпальтаў уключаны ў рукапісную частку Агульнага дваранскага гербоўніка [9, № 5]. Туды трапілі і князі Гедройцы, узбагаціўшы расійскую геральдыку, нягледзячы на тое, што род іх пачаў згасаць [10, № 3], і шляхта Мінскай губерні з такім прозвішчам ледзьве змагла даказаць сваю прыналежнасць да дваранства [11, л. 103], хаця і карысталася гербам «Гіпацэнтаўр».

З іншага боку, не ўсе прадстаўнікі арыстакратыі трапілі ў згаданы гербоўнік. Напрыклад, род Любамірскіх, нягледзячы на тое, што насіў тытул князёў Рымскай імперыі, там не прадстаўлены [12, с. 34].

Нельга гэты факт напрамую звязваць з сепаратысцкімі настроямі ў асяроддзі шляхты, аднак трэба прызнаць, што арыстакратыя былой Рэчы Паспалітай усё ж адрознівала сябе ад дваранства ўласнарасійскага. Паказальным тут з'яўляецца імкненне ўсіх выдаць свой гербоўнік, што і было зроблена ў 30-я гг. XIX ст. [13]. «Гербоўнік Царства Польскага» стаў толькі адной з праяў сепаратысцкіх настрояў шляхты. Граф Тадэвуш Тышкевіч не жадаў выязджаць з Варшавы на беларускія землі, каб атрымаць у спадчыну Свіслач, «не жадаў браць пашпарт у Расію», як пісаў у мемуарах ягоны прыёмны сын [14, с. 52].

Такім чынам, інкарпарацыя арыстакратыі былой Рэчы Паспалітай у расійскае дваранства праходзіла дастаткова паспяхова. Тыя асобы, што звязалі сябе з Расійскай імперыяй цывільнай ці вайсковай службай, шлюбам з прадстаўніком рускіх дваранскіх родаў, уключаліся ў шэрагі дваранства Расійскай імперыі без цяжкасцей. Аднак нельга не заўважыць, што свядомасць шляхты Рэчы Паспалітай не дазваляла ёй самой атаясамліваць сябе з расійскім дваранствам цалкам і канчаткова.

## Літаратура


1. Dunin-Borkowski J. Almanach blekitny. Genealogie zyjacych rodow polskich. – Lwow, 1908.
2. Дело о происхождении рода князей Друцких-Любецких // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1890.
3. Дело об определении дворянского рода разных лиц // НГАБ. Ф. 2152. Воп. 1. Спр. 232.
4. Грамота на права, вольности и преимущества благородного российского дворянства // Российское законодательство X–XX веков: В 9 т. – М., 1987. – Т. 5.
5. Дамарад А. А. Шляхі інтэграцыі шляхты ў склад дваранства Расійскай Імперыі // НИРС 2005. Сборник тезисов докладов X Республиканской научной конференции студентов и аспирантов Республики Беларусь, Минск, 14–15 февр. 2006 г. – Мн., 2005.
6. Долгорукий П. Российская родословная книга. – СПб., 1856. – Ч. 3.
7. Дело о дворянском происхождении рода графов Розвадовских // НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 2726.
8. Polski slownik biograficzny. – 1973. – Tom XVIII.
9. Общий гербовник дворянских родов Всероссийской империи, начатый в 1797 году. – СПб., 1904. – Ч. 17.
10. Общий гербовник дворянских родов Всероссийской империи, начатый в 1797 году. – СПб., 1885. – Ч. 13.
11. Дело о дворянском происхождении рода Гедройцей // НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 689.
12. Васильевич С. Титулованные роды Российской Империи. – СПб., 1910.
13. Гербовник дворянских родов Царства Польского, высочайше утвержденный. – Варшава, 1853. – Ч. 1.
14. Патоцкі Л. Пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану. – Мн., 1997.